# ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ» 1939–1941 гг.

**Ц. С. Савасцюк**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, tim2006ox@gmail.com*

У артыкуле аналізуецца адлюстраванне жыцця і дзейнасці гістарычнага факультэта БДУ на старонках газеты «За ленінскія кадры» за 1939–1941 гг. Разглядаюцца публікацыі, прысвечаныя выкладчыкам і студэнтам факультэта, іх поглядам, акадэмічнай дзейнасці і ідэалагічнай пазіцыі. Асаблівая ўвага надаецца рыторыцы газетных матэрыялаў, якія адлюстроўваюць асноўныя каштоўнасныя арыентацыі савецкай вышэйшай школы напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Аналізуюцца пытанні ідэалагічнага кантролю, фарміравання «савецкага гісторыка» і ўплыву дзяржаўнай палітыкі на адукацыйны працэс.

***Ключавыя словы:*** «За ленінскія кадры»; гістарычны факультэт; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; перадваенныя часы.

# ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ БГУ НА СТРАНИЦАХ ГАЗЕТЫ «ЗА ЛЕНИНСКИЕ КАДРЫ» 1939–1941 гг.

**Т. С. Совастюк**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, tim2006ox@gmail.com*

В статье анализируется освещение жизни и деятельности исторического факультета Белорусского государственного университета на страницах газеты «За ленинские кадры» за 1939–1941 гг. Рассматриваются публикации, посвященные преподавателям и студентам факультета, их взглядам, научной деятельности, идеологическим позициям. Особое внимание уделено риторике газетных материалов, отражающих основные ценностные ориентации советской высшей школы накануне Великой Отечественной войны. Анализируются вопросы идеологического контроля, формирования «советского историка» и влияния государственной политики на образовательный процесс.

***Ключевые слова:*** «За ленинские кадры»; исторический факультет; Белорусский государственный университет; предвоенное время.

# HISTORICAL FACULTY OF BSU ON THE PAGES OF THE NEWSPAPER “FOR LENIN'S CADRES” 1939–1941

**T. S. Sovastyuk**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, tim2006ox@gmail.com*

The article analyzes the depiction of the life and activities of the History Faculty of the Belarusian State University in the pages of the newspaper “For Leninist Cadres” for 1939–1941. The publications devoted to the faculty’s teachers and students, their views, academic activities and ideological positions are considered. Special attention is paid to the rhetoric of

newspaper materials reflecting the main value orientations of Soviet higher education on the eve of the Great Patriotic War. The issues of ideological control, the formation of the "Soviet historia" and the influence of state policy on the educational process are analyzed.

***Keywords:*** "For Lenin's Cadres"; Faculty of History; Belarusian State University; pre-war times.

Шматтыражныя газеты з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі беларускай савецкай вышэйшай адукацыі. Гістарычны факультэт, з'яўляючыся часткай БДУ, адыгрываў актыўную ролю ў фарміраванні інфармацыйнай прасторы ўніверсітэта, што падрыхтавала глебу для выдання ў 1929 г. шматтыражнай універсітэцкай газеты, назва якой да 1941 г. змянялася: «Ленінскім шляхам», «За пролетарские кадры», «За ленінскія кадры» [1, с. 227]. Аналіз гэтых выданняў дазваляе папоўніць новымі дадзенымі гісторыю факультэта, зразумець тэндэнцыі савецкай адукацыйнай палітыкі, ідэалагічныя настроі і асноўныя недахопы напярэдадні вайны.

На момант пачатку 1939 г. гістарычны факультэт, які пачаў свой ужо 5 год дзейнасці, не быў поўнасцю забяспечаны ў сваіх патрабаваннях. Адзін з аўтараў шматтыражкі пісаў, што «Гістфак, які налічвае каля 300 студэнтаў і мае 12 вучэбных груп, вымушан займацца толькі ў трох аўдыторыях». Не гледзячы на гэта, прафесарска-выкладчыцкі склад, супрацоўнікі і студэнты шчыра верылі ў тагачасныя ідэалы і шмат рабілі на карысць універсітэта. Аб настроі, які быў характэрны для калектыву факультэта, распавядаецца ў артыкуле «Наш універсітэт» за аўтарствам прафесара, акадэміка АН БССР Уладзіміра Мікалаевіча Перцава [2]. Аналізуючы газетныя тэксты, зразумела, немагчыма не прымаць да ўвагі нядаўнія жудасныя рэпрэсіі, якія скасавалі вялікую колькасць універсітэцкіх кадраў, што значна прыпыніла развіццё БДУ, у тым ліку і яго гістфака. Ідэялагічны кантроль і палітычная агітацыя прысутнічалі амаль што ў кожнай публікацыі прагледжаных нумароў. А з нумара ў нумар падаваліся артыкулы агульнатэарэтычнага характару. Напрыклад, тагачасны загадчык кафедры асноў марксізма-ленінізма І. С. Чымбург, актыўны навуковец (гісторык і філосаф), нядаўні дэкан гістарычнага факультэта і ў будучым рэктар БДУ [3, с. 109, 111] у перадваенныя гады апублікаваў ва ўніверсітэцкай шматтыражцы артыкулы «За большэвіцкае вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі», «Роль лічнасці ў гісторыі» і інш. [4].

У публікацыях газеты можна заўважыць некаторыя заканамернасці і абавязковыя элементы пры асвятленні як унутранага жыцця ўніверсітэта, так і ўсёй краіны. Напрыклад, друкаваліся справаздачы дэкана па выніках сесій, выходзілі спецыяльныя нумары, што былі адрасаваны выключна абітурыентам. Дарэчы, яны дасылаліся і ў саюзныя рэспублікі з-за зацікаўленасці там Беларускім універсітэтам.

На старонках газеты нярэдкімі былі крытычныя публікацыі. Студэнты выказвалі незадавальненне адсутнасцю падручнікаў, недахопам аўдыторый, а нават крытыкавалі сваіх выкладчыкаў. Так, ананімны першакурснік напісаў невялікі артыкул, у якім выказаў незадавальненне дзеяннямі дэкана А. П. П'янкова: маўляў, не дае студэнтам заўсёды зайсці на пару яшчэ на перапынку, а сам скончвае лекцыі не па званку. Аўтар задае пытанне: «хто даў права тав. Пьянкову злоўжываць савецкім законам?» [4]. Абсалютна крытычны змест меў артыкул пад характэрнай назвай «На гістфаке аб выпускніках не клапоцяцца» [5]. У артыкуле «На справаздачна-выбарчым сходзе» за аўтарствам К. І. Шабуні выказаны думкі аб прычынах нізкай студэнцкай дысцыпліны, не адпаведнай арганізаванасці кафедр, даецца крытыка ўзроўню кантролю за ўсім гэтым з боку партбюро факультэта [6].

Універсітэцкая газета абавязкова распавядала на сваіх старонках пра навукова-даследчую дзейнасць студэнтаў і выкладчыкаў. Адной з яе формаў быў конкурс даследчых студэнцкіх прац. У якасці ўзнагарод навучэнцы маглі стаць сталінскімі стыпендыятамі, атрымаць іншыя каштоўныя прэферэнцыі [7]. На факультэце праходзілі спецыяльныя канферэнцыі для студэнтаў. Напрыклад, адна з іх у 1939 г. была прысвечана вывучэнню прац Леніна і Сталіна [8]. Праводзіліся сумесныя навуковыя мерапрыемствы, як, напрыклад, канферэнцыя гістарычнага і філалагічнага факультэтаў па ўсебаковаму разгляду працы У. Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя». Па яе выніках былі адзначаны не зусім прыймальныя веды выступаўшых у галіне ідэялогіі (акрамя выкладчыка Старжынокава), што патрабавала ўзмацнення самастойнага вывучэння марксізма-ленінізма, каб адпавядаць патрабаванням, якія прад'яўляліся да вучоных і выкладчыкаў, што працуюць з моладдзю [9].

У газеце асобнае месца займалі артыкулы сталых гісторыкаў. Так, Д. А. Дудкоў у артыкуле «Да гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі» каротка падаў гісторыю жорсткага панавання палякаў у Беларусі, распавядаў пра ролю Сталіна, які ажыццявіў вызваленне беларускага народа ад засілля Польшчы, якую назваў увогуле штучнай дзяржвай [10]. Лёсавызначальная для беларускага народа і яго гісторыі падзея 17 верасня 1939 г. не засталася без увагі газеты. Дэкан гістарычнага факультэта А. П. П'янкоў узгадаў выступ па радыё старшыні СНК СССР і наркама замежных спраў В. М. Молатава. Ён адзначыў, што калектыў гістфака з задавальненнем сустрэў вызваленчы паход Чырвонай арміі, а студэнты выказвалі сваю падтрымку яднанню і бачылі ў гэтым злом дзяржавы, якая колькі часу прыгнятала беларусаў [11].

Іншая тэма закранута ў публікацыі акадэміка У. М. Перцава — аўтара артыкула «Кастрычніцкая рэвалюцыя і культура». Гісторык выказаў цікавае меркаванне наконт дэфініцыі тэрміна «культура». Ён піша, што «Пад

культурай наогул разумеецца паляпшэнне з дапамогай чалавечай працы — і разумовай, і фізічнай — умоў жыцця людзей і стварэнне новых сродкаў, з дапамогай якіх можна найлепшым чынам задавальняць нармальныя цатрабаванні чалавека — духоўныя і матэрыяльныя» [12]. На адной з тэарэтычных канферэнцый гістфака па пытаннях філасофіі і марксізма-ленінізма даследаванне «Паход Разіна к Сімбірску» атрымала шмат увагі і падтрымкі ў тым ліку ад дэкана А. П. П'янкова [13]. А яго аўтарам з'яўляўся студэнт Лаўрэн Абецэдарскі, які ў пасляваенныя гады стане адной з самых выбітных асоб беларускай гістарычнай навукі і ўніверсітэцкай адукацыі.

Гартаючы старонкі газеты за 1941 г. можна даведацца, што студэнцкі навуковы гурток на гістфаку напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны налічваў 30 студэнтаў. За першую палову 1941 г. яго ўдзельнікі прачыталі 6 дакладаў. Яго праца падмацоўвалася пастаяннай дапамогай з боку выкладчыкаў факультэта — дэкана А. П. П'янкова, акадэміка У. М. Перцава, дацэнтаў Л. М. Шнеерсона, Д. А. Дудкова і іншых. З ліку многіх газета вызначала тры найбольш добрыя студэнцкія даклады: Абецэдарскага (пра барацьбу беларускага і ўкраінскага народаў супраць Польшчы), Салтанава (пра першую хвалю рэвалюцыйнага настрою пасля рэвалюцыі 1905 г.), Цішкевіча (тэма даклада не пададзена) [14].

У газеце значная частка тэкстаў былі прысвечаны дакладнай асобе. Так, у 1939 г. адзін з нумароў распавядаў аб 35-гадовай навукова-педагагічнай дзейнасці Уладзіміра Мікалаевіча Перцава — аднаго з заснавальнікаў БДУ. Віншаванні і добрыя словы выказалі намеснік рэктара на вучэбнай працы дацэнт гістфака Леў Міхайлавіч Шнеерсон, аспірант Палуйка, шэраг студэнтаў [15]. У іншым нумары газеты У. М. Перцаў, як член дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі гістфака, даў свае каментары пра вопыт правядзення такіх экзаменаў і выказаў думку, што «Студэнты не павінны абмяжоўвацца веданнем тэмы толькі ў агульных рысах. Канкрэтнасць у ведах — гэта асноўнае патрабаванне, якое можна і патрэбна прад'яўляць да гісторыкаў» [16]. Распавядаецца і пра лекцыі самога акадэміка-гісторыка. Іх ацэнкі высокія — лекцыі вельмі якасныя, з прадстаўленнем схем, не «сухія», прыносяць нешта новае і цікавае [17].

У БДУ існаваў свой гісторыка-археалагічны музей, якім з 1938 г. кіраваў дацэнт кафедры гісторыі старажытнага часу і сярэдніх вякоў У. І. Шаўчэнка [18, с. 35]. Газета падае матэрыялы пра гісторыю ўтварэння, папаўнення і развіцця музея з восені 1927 г. (аб гэтым піша яго загадчык У. І. Шаўчэнка) [19]. Музей праводзіў экскурсіі для школьнікаў і студэнтаў, папулярызаваў гісторыю і дапамагаў пашырыць кола ведаў навучэнцаў. У музеі арганізоўваліся тэматычныя выставы (напрыклад, па гісторыі старжытнага Егіпта). Актыўны ўдзел у яго працы і складанні экспазіцыі

прымаў акадэмік М. М. Нікольскі. Музей прымаў новыя экспанаты ад студэнтаў і нават Эрмітажу, далучаў студэнтаў да прагляду савецкіх кінафільмаў [20]. Ужо пад час вайны, калі БДУ ўзнавіў сваю працу на станцыі Сходня пад Масквой, Уладзімір Іванавіч Шаўчэнка выконваў абавязкі загадчыка сваёй кафедры і нават некалькі месяцаў узначальваў гістарычны факультэт [18, с. 35–36].

Асаблівае месца ў штаттыражцы БДУ перадваенных гадоў займае падрыхтоўка да святкавання 20-годдзя БДУ. На працягу шэрагу нумароў пададзены разнастайныя нататкі да юбілею. У апошнім нумары перадваеннай газеты (№ 12 ад 12 чэрвеня 1941 г.) размешчаны план юбілейнай навуковай сесіі БДУ, дзе на 25 і 26 чэрвеня была запланавана дзейнасць гістарычнай секцыі. На ёй 25 чэрвеня адбыліся б выступленні акадэміка У. М. Перцава на тэму «Рэвалюцыйныя элементы буржуазнай ідэалогіі ў Германіі ў XVIII стагоддзі», дацэнта І. С. Чымбурга — «Плеханаў у годы сталыпінскай рэакцыі», старшага выкладчыка К. І. Шабуні — «Аграрнае пытанне ў Беларусі напярэдадні рэвалюцыі 1905–1907 гг.». На 26 чэрвеня былі запланаваны даклады акадэміка М. М. Нікольскага — «Прыватнае землеўладанне ў старажытным Двурэччы», дацэнта У. І. Шаўчэнкі — «Сялянская міфалогія эпохі крызісаў VIII–VIII і V–IV стст. да н. э. у старажытнай Грэцыі», дацэнта Г. В. Яфімава — «Да гісторыі Сімонасекскага дагавора» [21]. Аднак гэтыя планы парушыла Вялікая Айчынная вайна…

Вераломны напад ворага, нямецка-фашысцкая акупацыя Мінска не толькі адмянілі светкаванне юбілею, але часова прыпынілі дзейнасць БДУ. За 20 гадоў сваёй дзейнасці ўніверсітэт падрыхтаваў звыш 6000 спецыялістаў, а больш за 150 чалавек прайшлі аспірантуру [22, с. 162]. Сам гістарычны факультэт за 1934–1941 гг. выпусціў больш за 100 спецыялістаў (толькі ў 1941 г. планаваўся выпуск 24 гісторыкаў) [23].

Далей наступіць цяжкі час баявых дзеянняў і працы ў тыле, у барацьбе з ворагам загіне шмат выкладчыкаў і студэнтаў. Універсітэт і яго 6 факультэтаў восенню 1943 г. разпачнуць працу пад Масквой, а пасля перамогі вярнуцца ў Мінск. У хуткім часе адновіць сваю дзейнасць і ўніверсітэцкая газета, якая па-ранейшаму будзе шырока асвятляць самыя розныя бакі працы БДУ. Шматлікія нумары, якія захаваліся, сёння можна знайсці ў ацыроўцы. Яны з'яўляецца выдатнай друкаванай крыніцай па гісторыі БДУ, яго факультэтаў, кафедр, а нават і ўсёй Беларусі. Сучасныя даследчыкі могуць прасачыць праз газетныя публікацыі асноўныя падзеі ў жыцці калектыву, характар тагачасных праблем і шляхі іх вырашэння, этапы далейшай інстытуцыяналізацыі БДУ і беларускай вышэйшай адукацыі ў цэлым.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Яноўскі А. А.* Друкаваныя крыніцы па гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта 1920–1930-х гг.: стан і асаблівасці // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 1 / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэдактар) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2002. С. 220–228.
2. За ленінскія кадры. 1939. № 1.
3. *Яноўскі А. А.*, *Зельскі А. Г.* Гісторыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў біяграфіях яго рэктараў, 1921–2001 (80 гадоў). Минск: БДУ, 2001. 319 с.
4. За ленінскія кадры. 1939. № 3–5.
5. За ленінскія кадры. 1939. № 10.
6. За ленінскія кадры. 1940. № 4.
7. За ленінскія кадры. 1941. № 2.
8. За ленінскія кадры. 1939. № 8.
9. За ленінскія кадры. 1941. № 6.
10. За ленінскія кадры. 1940. № 14.
11. За ленінскія кадры. 1940. № 17, 21.
12. За ленінскія кадры. 1940. № 18.
13. За ленінскія кадры. 1941. № 4.
14. За ленінскія кадры. 1941. № 7.
15. За ленінскія кадры. 1939. № 17.
16. За ленінскія кадры. 1941. № 11.
17. За ленінскія кадры. 1941. № 5.
18. *Евтухов И. О.* Кафедра истории древнего мира и средних веков БГУ. К 80-летию создания. Минск: БГУ, 2015. 223 с.
19. За ленінскія кадры. 1941. № 3.
20. За ленінскія кадры. 1939. № 13.
21. За ленінскія кадры. 1941. № 12.
22. *Яноўскі А. А.* Універсітэцкія юбілеі — час падвесці вынікі і вызначыць перспектывы (1922–2001) // Роль университетского образования и науки в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., Минск, 26–27 февр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т; редкол.: А. Д. Король (пред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2019. С. 156–163.
23. За ленінскія кадры. 1941. № 9–10.